МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

УСТАНОВА АДУКАЦЫІ
"БРЭСЦКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ТЭХНІЧНЫ УНІВЕРСІТЭТ"

КАФЕДРА ГУМАНІТАРНЫХ НАВУК

Кавалёва Н.М., Малыхіна Л.Ю.

# МЕТАДЫЧНЫЯ РЭКАМЕНДАЦЫІ

# ПА ВЫВУЧЭННЮ ДЫСЦЫПЛІНЫ "ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСІ"

Брэст 2016

УДК 94(476)
ББК 63.3(4 Бел)
К 56 12

Рэцэнзент:
кандыдат філасофскіх навук, дацэнт, дэкан гістарычнага факультэта
УА “Брэсцкі дзяржаўны універсітэт імя А.С. Пушкіна” **А.П. Галімава**

**Кавалёва Н. М., Малыхіна Л.Ю.**
К 56 Метадычныя рэкамендацыі па вывучэнню дысцыпліны “Гісторыя Беларусі” (для студэнтаў усіх спецыяльнасцяў) / Агуль. рэд. Н.М. Кавалёвай. – Брэст: Брэсцкі дзяржаўны тэхнічны універсітэт, 2016. – 32 с.

ISBN 978-985-493-367-2

Выданне адпавядае вучэбнай праграме (рабочы варыянт) па абавязковым модулі “Гісторыя” (Гісторыя Беларусі ў кантэксце сусветных цывілізацый ), складзенай Кавалёвай Н.М., канд. гіст. навук, дацэнтам, прафесарам кафедры гуманітарных навук (зацверджана Саветам універсітэта 07.07.2015 г., рэгістрацыйны № УД -1-192 / уч.) у адпаведнасці з тыповай вучэбнай праграмай па абавязковым модулі “Гісторыя” (Гісторыя Беларусі ў кантэксце еўрапейскай цывілізацыі), зацверджанай Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь 30.06. 2014 г.

УДК 94(476)
ББК 63.3(4 Бел)

ISBN 978-985-493-367-2

© Кавалёва Н.М., Малыхіна Л.Ю., 2016
© Выдавецтва БрДТУ, 2016

# УВОДЗІНЫ

Шмат увагі на першых курсах ВНУ надаецца вывучэнню гісторыі Беларусі. Гістарычнае мінулае беларусаў з'яўляецца неад'емным багаццем, важным фактарам нацыянальнай адметнасці. Веданне гісторыі аб'ядноўвае грамадзян, кансалідуе іх сумесныя намаганні ва ўмацаванні краіны, выхоўвае ў моладзі маральнасць, патрыятызм і высокія чалавечыя ідэалы.

Вялікі аб'ём матэрыялу і навуковая праблематыка нацыянальнай гісторыі патрабуюць ад студэнтаў у працэсе падрыхтоўкі да семінарскіх заняткаў і выніковага іспыту сістэмнага і змястоўнага падыходу. Для яго забеспячэння ў гэтым вучэбна-метадычным дапаможніку студэнтам прапануюцца: па-першае, планы семінарскіх заняткаў з рэкамендаванай літаратурай і прыкладнымі тэмамі дакладаў; па-другое, глассарый. Апошні ў алфавітным парадку змяшчае асноўныя тэрміны і паняцці, персаналіі па айчыннай гісторыі з іх разгорнутым тлумачэннем і канкрэтнымі прыкладамі. Іх веданне дапаможа студэнтам актывізаваць веды, атрыманыя на лекцыях, а таксама ў выніку самастойнай працы з крыніцамі і літаратурай.

Прапанаваныя метадычныя рэкамендацыі даюць шырокае ўяўленне аб гісторыі Беларусі як вучэбнай дысціпліне і могуць быць карыснымі не толькі студэнтам і выкладчыкам, але і ўсім, хто цікавіцца пытаннямі нашай мінуўшчыны.

Метадычныя рэкамендацыі па вывучэнню дысцыпліны "Гісторыя Беларусі" складзены на аснове дзеючай тыпавой вучэбнай праграмы "Гісторыя Беларусі" і разлічаны на студэнтаў усіх спецыяльнасцяў УА "Брэсцкі дзяржаўны тэхнічны універсітэт".

## Семінар № 1
## Найстаражытнае насельніцтва на тэрыторыі беларускіх земель. Дзяржаўныя ўтварэнні на беларускіх землях у IX – XVI стст.

1. Перадумовы рассялення і гаспадарчай дзейнасці першабытных людзей на тэрыторыі Беларусі.
2. Зараджэнне і эвалюцыя прысвойваючай і вытвараючай форм гаспадаркі. Асаблівасці "неалітычнай рэвалюцыі" на Беларусі.
3. Станаўленне ранніх дзяржаўных утварэнняў усходніх славян на тэрыторыі Беларусі.
4. Сацыяльна-эканамічныя і палітычныя перадумовы фармавання ВКЛ.
5. Феадалізм як грамадска-эканамічны лад.
6. Асаблівасці станаўлення і развіцця феадалізму на тэрыторыі Беларусі.

### Тэмы для дакладаў:

- Этнічныя працэсы на беларускіх землях. Балты, славяне, іх роля ў этнагенезе беларусаў.
- Культура Беларусі IX – XIII стст.
- Асаблівасці развіцця духоўнай культуры беларускіх земель у ВКЛ.

### Літаратура:


1. Гісторыя Беларусі: вучэб. дапам: у 2 ч. / пад рэд. Я.К. Новіка, Г.С. Марцуля. – Мн.: Вышэйшая школа, 2006. – Ч.1: Ад старажытных часоў – па люты 1917 г. – 398 с.
2. Гісторыя Беларусі: у 2 ч.: курс лекцый / І.П. Крэнь, І.І. Коўкель [і інш.]. – Мн.: РІВШ БДУ, 2000. Ч. 1. Са старажытных часоў да канца XVIII ст.– 656 с.
3. Гісторыя Беларусі: у 6 т. / Рэдкал: М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – Мн., 2000. – Т.1: Старажытная Беларусь: Ад першапачатковага засялення да сярэдзіны XIII ст.
4. Кавалёва, Н.М. Вывучэнне праблем эканамічнай гісторыі ў курсе "Гісторыя Беларусі": вучэбна-метадычны дапаможнік / Н.М. Кавалёва, Л.Ю. Малыхіна; агуль. рэд. Н.М. Кавалёвай. – Брэст: УО "БрДТУ", 2010. – 88 с.
5. Кавалёва, Н.М. Гісторыя Беларусі (у кантэксце сусветных цывілізацый): выбраныя лекцыі / Н.М. Кавалёва, М.В. Стралец, Л.Ю. Малыхіна; пад рэд. Н.М. Кавалёвай. – Брэст, 2007. – 127 с.
6. Новик, Е.К. История Беларуси с древнейших времён до 2013 г. [Текст]: учебное пособие / Е.К. Новик, И.Л. Качалов, Н.Е. Новик; под ред. Е.К. Новика. – 4-е изд., испр. и доп. – Минск: Вышэйшая школа, 2013. – 558 с.
7. Саракавік, І.А. Гісторыя Беларусі ў кантэксце сусветнай гісторыі / І.А. Саракавік. – Мн.: Современная школа, 2006. – 456 с.
8. Экцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. / рэд. калегія: М.В. Біч, А.П. Грыцкевіч, М.І. Ермаловіч) [і інш.]. – Мн.: " Беларуская энцыклапедыя" імя Петруся Броўкі, 1993. – Т.1 (арт. "Балты", "Беларусы"); Т. 3. – Мн., 1996 (арт. "Жывелагадоўля", "Земляробства").

**Дадатковая літаратура:**

9. Археалогія і нумізматыка Беларусі. Энцыклапедыя / рэд калегія: В.В. Гетаў, У.Ф Ісаенка [і інш.]. – Мн.: "Беларуская энцыклапедыя" імя Петруся Броўкі, 1993. –702 с.

10. Вялікае княства Літоўскае: Энцыклапедыя: у 2 т. / рэдкал.: Г.П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]; маст. З.Э. Герасімовіч. – 2-е выд. – Мн.: "Беларуская энцыклапедыя" імя Петруся Броўкі, 2007. – Т.І. – 686 с.; Т.2. – 789 с.

11. Ермаловіч, М. Старажытная Беларусь. Віленскі перыяд. – Мн.: Выдавецкі цэнтр "Бацькаўшчына" МП " Бесядзь", 1994. –90 с.

12. Ермаловіч, М. Старажытная Беларусь. Полацкі і Новагародскі перыяды. – Мн.: Маст. літаратура, 1990. – 366 с; іл.

13. Папко, В.М. Гісторыя культуры Беларусі / В.М. Папко, М.В. Стралец, С.М. Васовіч, П.У. Малашук. – Брэст: Установа адукацыі "Брэсцкі дзяржаўны тэхнічны універсітэт", 2010. – 98 с.

14. Самусік, А.Ф. Помнікі гісторыі і культуры Беларусі: вучэб. дап. – Мн.: БДЭУ, 2004. – 209 с.

15. Штыхаў, Г.В. Старажытныя дзяржавы на тэрыторыі Беларусі / Г.В. Штыхаў. – 2-е выд., выпр. – Мн.: Права і эканоміка, 2002. – 94 с.

## Семінар № 2
## **Беларускія землі ў складзе Рэчы Паспалітай (1569 – 1795)**

1. Прычыны заключэння Люблінскай уніі 1569 г. Утварэнне Рэчы Паспалітай.
2. Эвалюцыя форм дзяржаўнага і сацыяльна-палітычнага ладу на беларускіх землях пасля Люблінскай уніі.
3. Наступствы войнаў XVI – XVIII стст. для беларускага народа.
4. Эканамічны і палітычны стан беларускіх зямель у XVII – XVIII стст.
5. Праявы станаўлення капіталістычных адносін на беларускіх землях ў другой палове XVIII ст. у працэсе пераадолення эканамічнага заняпаду.
6. Падзелы Рэчы Паспалітай.

**Тэмы для дакладаў:**

- Асаблівасці складвання канфесійных адносін на тэрыторыі Беларусі ў XVI – XVIII стст.
- Стан беларускай культуры ў эпоху Контррэфармацыі і Асветніцтва.

**Літаратура:**

1. Гісторыя Беларусі. Вучэб. дапам: у 2 ч. / пад рэд. Я.К. Новіка, Г.С. Марцуля. – Мн.: Вышэйшая школа, 2006. Ч.1: Ад старажытных часоў – па люты 1917 г. – 398 с.

2. Гісторыя Беларусі: у 2 ч. / І.П. Крэнь, І.І. Коўкель [і інш.]. – Мн.: РІВШ БДУ, 2000. Ч.1: Са старажытных часоў да канца XVIII ст.: Курс лекцый. – 656 с.

3. Кавалёва, Н.М. Вывучэнне праблем эканамічнай гісторыі ў курсе "Гісторыя Беларусі": вучэбна-метадычны дапаможнік / Н.М. Кавалёва, Л.Ю. Малыхіна; агуль. рэд. Н.М. Кавалёва. – Брэст: УО "БрДТУ", 2010. – 88 с.

4. Кавалёва, Н.М. Гісторыя Беларусі (у кантэксце сусветных цывілізацый): выбраныя лекцыі / Н.М. Кавалёва, М.В. Стралец, Л.Ю. Малыхіна; пад рэд. Н.М. Кавалёвай. – Брэст 2007. – 127 с.

5. Новик, Е.К. История Беларуси с древнейших времён до 2013 г. [Текст]: учебное пособие / Е.К. Новик, И.Л. Качалов, Н.Е. Новик; под ред. Е.К. Новика. – 4-е изд., испр. и доп. – Минск: Вышэйшая школа, 2013. – 558 с.

6. Саракавік, І.А. Гісторыя Беларусі ў кантэксце сусветнай гісторыі / І.А. Саракавік. – Мн.: Современная школа, 2006.– 456 с.

**Дадатковая літаратура:**

7. Археалогія і нумізматыка Беларусі. Энцыклапедыя / рэд калегія: В.В. Гетаў, У.Ф Ісаенка [і інш.]. – Мн.: " Беларуская энцыклапедыя" імя Петруся Броўкі, 1993. –702 с.

8. Верашчагіна, А. Гісторыя канфесій у Беларусі: мінулае і сучаснасць / А. Верашчагіна, А. Гурко. – Мн., 2000.

9. Вялікае княства Літоўскае: Энцыклапедыя: У 2 т. / рэдкал.: Г.П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]; маст. З.Э. Герасімовіч. – 2-е выд. – Мн.: – Мн.: "Беларуская энцыклапедыя" імя Петруся Броўкі, 2007. – Т. 1. – 686 с.; Т. 2. – 789 с.

10. Лыч, Л. Гісторыя культуры Беларусі / Л. Лыч, У. Навіцкі. – Мн.: НКФ "Экаперспектыва", 1996. – 453 с.

11. Папко, В.М. Гісторыя культуры Беларусі / В.М. Папко, М.В. Стралец, С.М. Васовіч, П.У. Малашук. – Брэст: Установа адукацыі "Брэсцкі дзяржаўны тэхнічны універсітэт", 2010. – 98 с.

12. Самусік, А.Ф. Помнікі гісторыі і культуры Беларусі: вучэб. дап. – Мн.: БДЭУ, 2004. – 209 с.

13. Юхо, І. Крыніцы беларуска-літоўскага права. – Мн.: Беларусь, 1991. – 237 с.

## Семінар № 3
## Беларускія землі ў складзе Расійскай імперыі

1. Сутнасць русіфікацыі як палітыкі царскага ўраду на беларускіх землях.
2. Беларускі нацыянальна-вызваленчы рух, яго асноўныя мэты і этапы.
3. Развіццё і зацвярджэнне капіталістычнага укладу ў Еўропе і Амерыцы, фармаванне еўраамерыканскай індустрыяльнай цывілізацыі.
4. Сялянская рэформа 1861 года і асаблівасці яе рэалізацыі на Беларусі.
5. Расійскі шлях палітычнай мадэрнізацыі. Буржуазныя рэформы 60-70-х гадоў XIX ст., асаблівасці іх правядзення на Беларусі.
6. Развіццё капіталістычных адносін на беларускіх землях у прамысловасці і сельскай гаспадарцы у парэформенны час.
7. Эканамічнае развіццё Беларусі ў перыяд манапалістынага капіталізму.

**Тэмы для дакладаў:**

- Паўстанне 1863 – 1864 гг., яго ўплыў на грамадска-палітычнае жыццё.
- Беларуская культура XIX ст.
- Беларускае нацыянальна-культурнае Адраджэнне канца XIX – пачатку XX ст.

**Літаратура :**


1. Гісторыя Беларусі. Вучэб. дапам: у 2 ч. / пад рэд. Я.К. Новіка, Г.С. Марцуля. – Мн.: Вышэйшая школа, 2006. Ч.1: Ад старажытных часоў – па люты 1917 г. – 398 с.

2. Гісторыя Беларусі: з 1795 г. да вясны 1917 г.: вучэб. дапам. / пад рэд. І.П. Крэня, І.І. Коўкеля. – Мн.: Аверсэв, 2001. – 400 с.

3. Гісторыя Беларусі: у 2 ч. / П.І. Брыгадзін., У.Ф. Ладысеў [і інш.]. – Мн.: РІВШ БДУ, 2002 Ч. 2: XIX – XX ст.: Курс лекцый. – 656 с.

4. Гісторыя Беларусі: у 6 т. / рэдкал. М. Касцюк [і інш.] – Мн.: "Экаперспектыва", 2005. Т. 4: Беларусь у складзе Расійскай імперыі. – 519 с.

5. История Беларуси: полный курс. Учебное пособие / А.Г. Кохановский [и др.] – Мн.: Юнипресс, 2010. – 512 с.

6. Кавалёва, Н.М. Вывучэнне праблем эканамічнай гісторыі ў курсе "Гісторыя Беларусі": вучэбна-метадычны дапаможнік / Агуль. рэд. Н.М. Кавалёва. – Брэст: УО "БрДТУ", 2010. – 88 с.

7. Кавалёва, Н.М. Гісторыя Беларусі (у кантэксце сусветных цывілізацый): выбраныя лекцыі / пад рэд. Н.М. Кавалёвай. – Брэст, 2007.– 127 с.

8. Новик, Е.К. История Беларуси с древнейших времён до 2013 г. [Текст]: учебное пособие / Е.К. Новик, И.Л. Качалов, Н.Е. Новик; под ред. Е.К. Новика. – 4-е изд., испр. и доп. – Минск: Вышэйшая школа, 2013. – 558 с.

9. Экцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. / рэд. калегія: М.В. Біч, А.П. Грыцкевіч, М.І. Ермаловіч) [і інш.]. – Мн.: "Беларуская энцыклапедыя" імя Петруся Броўкі, 1993. – Т. I (арт. "Асвета", "Беларускі нацыянальна-вызваленчы рух"); Т 2. (арт. "Буржуазія"); Т 3. (арт "Земская рэформа").


**Дадатковая літратура:**


10. Довнар-Запольский, М.В. История Белоруссии [Текст] – 2-е изд. – Мн.: Беларусь, 2005. – 680 с.

11. Лыч, Л. Гісторыя культуры Беларусі / Л. Лыч, У. Навіцкі. – Мн.: НКФ "Экаперспектыва", 1996. – 453 с.

12. Папко, В.М. Гісторыя культуры Беларусі / В.М. Папко, М.В. Стралец, С.М. Васовіч, П.У. Малашук. – Брэст: Установа адукацыі "Брэсцкі дзяржаўны тэхнічны універсітэт", 2010. – 98 с.

13. Самусік, А.Ф. Помнікі гісторыі і культуры Беларусі: вучэб. дап. – Мн.: БДЭУ, 2004. – 209 с.

14. Шыбека, З. Нарыс гісторыі Беларусі. 1795 – 2002. – Мн.: Энцыклапедыкс, 2003. – 490 с.

Семінар № 4

## Станаўленне беларускай дзяржаўнасці

1. Прычыны і пачатак Першай сусветнай вайны. Ваенныя дзеянні на тэрыторыі Беларусі.
2. Лютаўская і Кастрычніцкая рэвалюцыі 1917 г. Новая расстаноўка палітычных сіл.
3. Паўночна-Заходні край у 1917 г. Палітычныя партыі, іх праграмы па беларускаму пытанню.
4. Абвяшчэнне БНР, яе гістарычнае месца.
5. Утварэнне БССР, яе дзяржаўна-прававы статус.
6. Вайна Літоўска-Беларускай ССР з Польшчай. Другое абвяшчэнне БССР.
7. Роля і месца БССР у стварэнні СССР.

**Тэмы для дакладаў:**

- Эканамічныя і палітычныя фактары фармавання беларускай нацыі ў XIX – пачатку XX ст.
- Афармленне агульнарасійскіх палітычных партый.

**Літаратура:**

1. Гісторыя Беларусі. Вучэб. Дапам: у 2 ч. / пад рэд. Я.К. Новіка, Г.С. Марцуля. – 3-е выд., дапрац. і дап. – Мн.: Універсітэцкае, 2007. – Ч. 2: Люты 1917 г. – 2006 г. – 445 с.

2. Гісторыя Беларусі: у 2 ч. / П.І. Брыгадзін., У.Ф. Ладысеў [і інш.]. – Мн.: РІВШ БДУ, 2002. – Ч. 2. XIX – XX ст.: Курс лекцый. – 656 с.

3. История Беларуси: полный курс: учебн. пособие / А.Г. Кохановский [и др.]. – Минск: Юнипресс, 2010. – 512 с.

4. Кавалёва, Н.М. Гісторыя Беларусі (у кантэксце сусветных цывілізацый): выбраныя лекцыі / Н.М. Кавалёва, М.В. Стралец, Л.Ю. Малыхіна; пад рэд. Н.М. Кавалёвай. – Брэст, 2007. – 127 с.

5. Новик, Е.К. История Беларуси с древнейших времён до 2013 г. [Текст]: учебное пособие / Е.К. Новик, И.Л. Качалов, Н.Е. Новик; под ред. Е.К. Новика. – 4-е изд., испр. и доп. – Минск: Вышэйшая школа, 2013. – 558 с.

6. Саракавік, І.А. Гісторыя Беларусі ў кантэксце сусветнай гісторыі / І.А. Саракавік. – Мн.: Современная школа, 2006. – 456 с.

7. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. / рэд. калегія: М.В. Біч, А.П. Грыцкевіч, М.І. Ермаловіч) [і інш.]. – Мн.: “Беларуская энцыклапедыя” імя Петруся Броўкі, 1993. Т. І (арт. “Беларуская Народная Рэспубліка”, “Беларуская Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка”, “Беларуская сацыялістычная грамада”).

**Дадатковая літаратура:**

8. Иоффе, Э.Г. От Мясникова до Малофеева: кто руководил БССР / Э.Г. Иоффе. – Минск: Беларусь, 2008. – 287 с.

9. Круталевич, В.А. История Беларуси: становление национальной державности (1917 –1922 гг.) / В.А. Круталевич. – 2-е изд. доп. – Мн.: Право и экономика, 2003. – 592с.

10. Ладысеў, У.Ф. Паміж Усходам і Захадам: станаўленне дзяржаўнасці і тэрытарыяльнай цэласнасці Беларусі (1917–1939 гг.) / У.Ф. Ладысеў, П.І. Брыгадзін. – Мн., 2003.

11. Малыхіна, Л.Ю. Гістарыяграфія Літоўска-Беларускай ССР / Л.Ю. Малыхіна, У.М. Міхнюк. – Брэст: Брэсцкі дзяржаўны тэхнічны універсітэт, 2005. – 160 с.

12. Марцуль, Г.С. Гісторыя Беларусі: насельніцтва, фарміраванне і вызначэнне этнічных і дзяржаўна-адміністрацыйных межаў. Беларускае замежжа: Вуч. дап. / Г.С. Марцуль, М.С. Сташкевіч. – Мн.: РІВШ пры БДУ, 1997. – 132 с.

13. Шыбека, З. Нарыс гісторыі Беларусі. 1795 – 2002. – Мн.: Энцыклапедыкс, 2003. – 490 с.

## Семінар № 5
## Заканамернасці і асаблівасці мадэрнізацыі беларускага грамадства ў савецкі перыяд

1. Усталяванне савецкай грамадска-палітычнай сістэмы ў БССР і яе асноўныя характарыстыкі.
2. Асаблівасці ажыццяўлення НЭПа ў БССР.
3. Стварэнне матэрыяльна-тэхнічнай базы індустрыяльна-аграрнага грамадства: правядзенне палітыкі індустрыялізацыі і калектывізацыі сельскай гаспадаркі.
4. Фармаванне адміністрацыйна-каманднай эканомікі.
5. Эканамічная рэформа 1965 г. і яе вынікі.
6. Эканоміка Беларусі ў 70-я – першай палове 80-х гадоў. Прычыны паступовага запавольвання тэмпаў эканамічнага росту і ўзнікнення цяжкасцяў у сацыяльнай сферы.

### Тэмы для дакладаў:

- Станаўленне і развіццё савецкай беларускай культуры. Палітыка беларусізацыі.
- Спробы дэмакратызацыі грамадска-палітычнага жыцця ў 1950-я – 1960-я гг.
- Грамадска-палітычнае жыццё БССР у 1970-я – першай палове 1980-х гадоў.

### Літаратура:

1. Гісторыя Беларусі. Вучэб. дапам: у 2 ч. / пад рэд. Я.К. Новіка, Г.С. Марцуля. – 3-е выд., дапрац. і дап. – Мн.: Універсітэцкае, 2007. – Ч.2. Люты 1917 г. – 2006 г. – 445 с.

2. Гісторыя Беларусі: у 2 ч. / П.І. Брыгадзін., У.Ф. Ладысеў [і інш.]. – Мн.: РІВШ БДУ, 2002. – Ч. 2. XIX – XX ст.: Курс лекцый – 656 с.

3. История Беларуси: полный курс: учебн. пособие / А.Г. Кохановский [и др.]. – Минск: Юнипресс, 2010. – 512 с.

4. Кавалёва, Н.М. Вывучэнне праблем эканамічнай гісторыі ў курсе "Гісторыя Беларусі": вучэбна-метадычны дапаможнік / Н.М. Кавалёва, Л.Ю. Малыхіна; агуль. рэд. Н.М. Кавалёвай. – Брэст: УО "БрДТУ", 2010. – 88 с.

5. Кавалёва, Н.М. Гісторыя Беларусі (у кантэксце сусветных цывілізацый): выбраныя лекцыі / Н.М. Кавалёва, М.В. Стралец, Л.Ю. Малыхіна; пад рэд. Н.М. Кавалёвай. – Брэст, 2007. – 127 с.

6. Новик, Е.К. История Беларуси с древнейших времён до 2013 г. [Текст]: учебное пособие / Е.К. Новик, И.Л. Качалов, Н.Е. Новик; под ред. Е.К. Новика. – 4-е изд., испр. и доп. – Минск: Вышэйшая школа, 2013. – 558 с.

7. Эканамічная гісторыя Беларусі: вучэбны дапаможнік для студэнтаў эканамічных спецыяльнасцей ВНУ / В.І. Галубовіч, Р.І. Ермашкевіч, Г.П. Бушчык [і інш.]; пад агульнаай рэд. В.І. Галубовіча. Выд 3-е, дап. і перапрац. – Мн.: НКФ " Экаперспектыва", 1999. – 447 с.

**Дадатковая літаратура:**

8. Беларусь на мяжы тысячагоддзяў / І.М. Абрамаў [і інш.]; пад рэд. А.П. Вайтовіч [і інш.]. – Мн.: Беларуская энцыклапедыя, 2000. – 429 с.

9. Иоффе, Э.Г. От Мясникова до Малофеева: кто руководил БССР / Э.Г. Иоффе. – Минск: Беларусь, 2008. – 287 с.

10. Папко, В.М. Гісторыя культуры Беларусі / В.М. Папко, М.В. Стралец, С.М. Васовіч, П.У. Малашук. – Брэст: Установа адукацыі "Брэсцкі дзяржаўны тэхнічны універсітэт", 2010. – 98 с.

11. Шыбека, З. Нарыс гісторыі Беларусі. 1795 – 2002. – Мн.: Энцыклапедыкс, 2003. – 490 с.

## Семінар № 6
## **Заходняя Беларусь у складзе Польскай дзяржавы**

1. Геапалітычнае становішча беларускіх зямель ва ўмовах фармавання Версальска-Вашынгтонскай сістэмы.
2. Грамадска-палітычнае становішча Заходняй Беларусі ў складзе Польскай дзяржавы.
3. Эканамічнае становішча Заходняй Беларусі ў складзе Польскай дзяржавы.
4. Культура Заходняй Беларусі.
5. Пачатак Другой сусветнай вайны. Уз'яднанне Заходняй Беларусі з БССР.
6. Першыя сацыялістычныя пераўтварэнні ў Заходняй Беларусі.

**Тэмы для дакладаў:**

- Грамадска-палітычныя дзеячы Заходняй Беларусі.
- Палітыка вядучых краін свету ва ўмовах нарастання пагрозы вайны. Савецка-германскія пагадненні 1939 г.
- Вынікі працэсу афармлення тэрыторыі БССР ва ўмовах Другой сусветнай вайны.

**Літаратура:**

1. Гісторыя Беларусі. Вучэб. дапам: у 2 ч. / пад рэд. Я.К. Новіка, Г.С. Марцуля. – 3-е выд., дапрац. і дап. – Мн.: Універсітэцкае, 2007. – Ч.2. Люты 1917 г.– 2006 г. – 445 с.

2. Гісторыя Беларусі: у 2 ч. / П.І. Брыгадзін, У.Ф. Ладысеў [і інш.]. – Мн.: РІВШ БДУ, 2002. – Ч. 2. XIX – XX ст.: Курс лекцый. – 656 с.

3. История Беларуси: полный курс: учебн. пособие / А.Г. Кохановский [и др.]. – Минск: Юнипресс, 2010. – 512 с.

4. Новик, Е.К. История Беларуси с древнейших времён до 2013 г. [Текст]: учебное пособие / Е.К. Новик, И.Л. Качалов, Н.Е. Новик; под ред. Е.К. Новика. – 4-е изд., испр. и доп. – Минск: Вышэйшая школа, 2013. – 558 с.

5. Саракавік, І.А. Гісторыя Беларусі ў кантэксце сусветнай гісторыі / І.А. Саракавік. – Мн.: Современная школа, 2006. – 456 с.

6. Эканамічная гісторыя Беларусі. Вучэбны дапаможнік / В.І. Галубовіч, Р.І. Ермашкевіч, Г.П. Бушчык [і інш.]; пад агульнаай рэд. В.І. Галубовіча. – Выд 2-е, дап. і перапрац. – Мн.: НКФ “ Экаперспектыва”, 1996. – 432 с.

7. Экцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. / рэд. калегія: Г.П. Пашкоў (галоўны рэдактар) [і інш.]. – Мн.: “Беларуская энцыклапедыя” імя Петруся Броўкі. – 1996. –Т. 3. – 524 с. (арт. “Заходняя Беларусь”).

**Дадатковая літаратура:**

8. Беларусь на мяжы тысячагоддзяў / І.М. Абрамаў [ і інш.]; пад рэд. А.П. Вайтовіч [і інш.]. – Мн.: Беларуская энцыклапедыя, 2000.– 429 с.

9. Гісторыя Беларусі: у 6 т. / А. Вабішчэвіч [і інш.]; / рэдкал.: М. Касцюк (гал. рэд.) і інш.. – Мн.: Экаперспектыва, 2006. – Т. 5. Беларусь у 1917 – 1945 гг. – 613 с; іл.

10. Папко, В.М. Гісторыя культуры Беларусі / В.М. Папко, М.В. Стралец, С.М. Васовіч, П.У. Малашук. – Брэст: Установа адукацыі “Брэсцкі дзяржаўны тэхнічны універсітэт”, 2010. – 98 с.

11. Шыбека, З. Нарыс гісторыі Беларусі. 1795 – 2002. – Мн.: Энцыклапедыкс, 2003. – 490 с.

## Семінар № 7.
## Беларусь у гады Другой сусветнай і Вялікай Айчыннай вайны

1. Прычыны і пачатак Другой сусветнай вайны.
2. Пачатак Вялікай Айчыннай вайны. Абарончыя баі на тэрыторыі Беларусі.
3. Акупацыйны рэжым у Беларусі (адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел, эканамічная палітыка, палітыка генацыда).
4. Германская прапаганда і агітацыя. Калабарацыянізм.
5. Асноўныя этапы станаўлення і развіцця партызанскага руху на тэрыторыі Беларусі.
6. Партыйнае, камсамольскае і антыфышысцкае падполле. Нацыяналістычнае польскае і украінскае падполле ў заходніх абласцях Беларусі.
7. Вызваленне Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.
8. Вынікі вайны для беларускага народа і яго ўклад у Перамогу над фашызмам.

**Тэмы для дакладаў:**

- Сталінградская і Курская бітвы. Карэнны перадом у вайне.
- Вызваленне краін Еўропы ад фашызму Чырвонай Арміяй.

**Літаратура:**

1. Великая Отечественная война советского народа (в контексте Второй мировой войны): учебное пособие для студентов учреждений, обеспечивающих получение высшего образования (А.А. Коваленя [и др.]); / под ред. А.А. Ковалени и Н.С. Сташкевича; пер. с бел. яз. А.В. Скорохода. – Мн., 2004. – 279 с.: ил., карт.

2. Гісторыя Беларусі. Вучэб. дапам: у 2 ч. / пад рэд. Я.К. Новіка, Г.С. Марцуля. – 3-е выд., дапрац. і дап. – Мн.: Універсітэцкае, 2007. – Ч. 2. Люты 1917 г.– 2006 г. – 445 с.

3. Гісторыя Беларусі: у 2 ч. / П.І. Брыгадзін, У.Ф. Ладысеў [і інш.]. – Мн.: РІВШ БДУ, 2002. – Ч. 2. XIX – XX ст.: Курс лекцый. – 656 с.

4. Малыхина, Л.Ю. Великая Отечественная война советского народа (в контексте Второй мировой войны): учебно-методический комплекс: в 2-х частях / Л.Ю. Малыхина, Т.В. Лисовская. – Брест: УО "БрГТУ", 2011. – Ч. I. Конспект лекций.

5. Саракавік, І.А. Гісторыя Беларусі ў кантэксце сусветнай гісторыі / І.А. Саракавік. – Мн.: Современная школа, 2006. – 456 с.

**Дадатковая літаратура:**

6. Беларусь в годы Великой Отечественной войны. 1941 – 1945 гг. / А.А. Коваленя (рук. авт. коллектива), А.М. Литвин, В.И. Кузьменко [и др.]. – Минск: Белта, 2005. – 544 с.

7. Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне: Дзень за днём (ілюстраваная храналогія вайны (1939 – 1945). Хронологический справочник. – Мінск, 2004.

8. Беларусь у Другой сусветнай і Вялікай Айчыннай войнах // Гісторыя Беларусі: у 6 т. Т. 5: Беларусь у 1917 – 1945 гг. / А. Вабішчэвіч [і інш.]; / рэдкал.: М. Касцюк (гал. рэд.) і інш. – Мн.: Экаперспектыва. – 2006. – 613 с; іл.

## Семінар № 8
## Рэспубліка Беларусь у канцы XX – пачатку XXI ст.

1. Сутнасць стратэгіі новага палітычнага мышлення. Змены ў сістэме міжнародных адносін на мяжы XX – XXI стст.

2. Першыя спробы перабудовы эканомікі ў другой палове 1980-х гг. Прычыны крызісу савецкай эканамічнай сістэмы канца 1980-х гг.

3. Спробы мадэрнізацыі савецкай грамадска-палітычнай сістэмы падчас палітыкі перабудовы. Жнівеньскія падзеі 1991 г. у СССР і БССР.

4. Абвяшчэнне Рэспублікі Беларусь. Заканадаўча-прававое афармленне дзяржаўнага суверэнітэту Рэспублікі Беларусь.

5. Праграма пераходу да рынкавай эканомікі 1990 г. і яе рэалізацыя ў Рэспубліцы Беларусь.

6. Станаўленне і рэалізацыя беларускай мадэлі сацыяльна арыентаванай эканомікі.

**Тэмы для дакладаў:**

- Распад СССР і ўтварэнне СНД.
- Міжнароднае прызнанне Рэспублікі Беларусь і змены ў знешнепалітычным механізме краіны.
- Стан гісторыка-культурнай спадчыны.

**Літаратура:**


1. Гісторыя Беларусі. Вучэб. дапам: у 2 ч. / пад рэд. Я.К. Новіка, Г.С. Марцуля. – 3-е выд., дапрац. і дап. – Мн.: Універсітэцкае, 2007. – Ч. 2. Люты 1917 г. – 2006 г. – 445 с.

2. Гісторыя Беларусі: у 2 ч. / П.І. Брыгадзін, У.Ф. Ладысеў [і інш.]. – Мн.: РІВШ БДУ, 2002. – Ч. 2. XIX – XX ст.: Курс лекцый – 656 с.

3. История Беларуси: полный курс: учебн. пособие / А.Г. Кохановский [и др.]. – Минск: Юнипресс, 2010. – 512 с.

4. Кавалёва, Н.М. Вывучэнне праблем эканамічнай гісторыі ў курсе "Гісторыя Беларусі": вучэбна-метадычны дапаможнік / Н.М. Кавалёва, Л.Ю. Малыхіна; Агуль. рэд. Н.М. Кавалёва. – Брэст: УО "БрДТУ", 2010. – 88 с.

5. Кавалёва, Н.М. Гісторыя Беларусі ( у кантэксце сусветных цывілізацый): выбраныя лекцыі / Н.М. Кавалёва, М.В. Стралец, Л.Ю. Малыхіна; пад рэд. Н.М. Кавалёвай. – Брэст: БрДТУ, 2007. – 127 с.

6. Новик, Е.К. История Беларуси с древнейших времён до 2013 г. [Текст]: учебное пособие / Е.К. Новик, И.Л. Качалов, Н.Е. Новик; под ред. Е.К. Новика. – 4-е изд., испр. и доп. – Минск: Вышэйшая школа, 2013. – 558 с.

7. Саракавік, І.А. Гісторыя Беларусі ў кантэксце сусветнай гісторыі / І.А. Саракавік. – Мн.: Современная школа, 2006. – 456 с.

8. Эканамічная гісторыя Беларусі. Вучэбны дапаможнік / В.І. Галубовіч, Р.І. Ермашкевіч, Г.П. Бушчык [і інш.]; пад агульнаай рэд. В.І. Галубовіча. – Выд 2-е, дап. і перапрац. – Мн.: НКФ " Экаперспектыва", 1996. – 432 с.


**Дадатковая літаратура:**


9. Беларусь на мяжы тысячагоддзяў / І.М. Абрамаў [і інш.]; пад рэд. А.П. Вайтовіч [і інш.]. – Мн.: Беларуская энцыклапедыя, 2000. – 429 с.

10. Гісторыя Беларусі: у 6 т. / Л. Лыч [і інш.]; рэдкал.: М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: Современная школа, Экоперспектива, 2011. – Т 6. Беларусь у 1946 – 2009 гг. – 728 с.; іл.

11. Папко, В.М. Гісторыя культуры Беларусі / В.М. Папко, М.В. Стралец, С.М. Васовіч, П.У. Малашук. – Брэст: Установа адукацыі "Брэсцкі дзяржаўны тэхнічны універсітэт", 2010. – 98 с.

## ГІСТАРЫЧНЫЯ ПАНЯЦЦІ І ТЭРМІНЫ:

**Абсалютызм** (ад лац. absolutus – безумоўны, неабмежаваны) – форма дзяржаўнага кіравання, пры якой існуе неабмежаваная вярхоўная ўлада манарха (неабмежаваная манархія). У другім значэнні – перыяд у новай гісторыі Еўропы (Заходняй Еўропы – XVII – XVIII стст., у Расіі – XVIII ст. – пачатак XX ст.), калі існавалі абсалютныя манархіі.

**Антанта** (ад франц. Entente, Entente cordiale – "сардэчная згода" або "Траістае пагадненне") – ваенна-палітычны саюз Расіі, Вялікабрытаніі і Францыі, які афарміўся ў 1904 – 1907 гг. і быў скіраваны супраць ваеннага блоку Траістага саюза (Германія, Аўстра-Венгрыя, Італія). У гады Першай сусветнай вайны (1914 – 1918) вакол Антанты аб'ядналася больш 20 дзяржаў. Саюзнікі абавязаліся не падпісваць сепаратнага міру, але савецкі урад Расіі пайшоў на заключэнне Брэсцкага мірнага дагавора ад 3 сакавіка 1918 г.

**Антыгітлераўская кааліцыя** – ваенна-палітычны саюз ЗША, Вялікабрытаніі, СССР і іншых краін у час Другой сусветнай вайны, накіраваны на барацьбу з нямецка-фашысцкай агрэсіяй, які прадугледжваў ваенныя пастаўкі, сумесную каардынацыю дзейнасці ў ваеннай сферы і па пасляваеннаму ўладкаванню. Дзейнічала на аснове Атлантычнай хартыі (жнівень 1941 г.), Першага (Маскоўскага) пратакола ад 1 кастрычніка 1941 г., Дэкларацыі Аб'яднаных Нацый (студзень 1942 г.) і іншых пагадненняў.

**Антычнасць** – перыяд існавання першых цывілізацый ў Еўропе – Старажытнай Грэцыі і Старажытнага Рыму – у III-II тысячагоддзі да н.э. – V ст. н.э., якія сталі падмуркам для сучасных заходнееўрапейскай і ўсходне-праваслаўнай цывілізацый.

**Асадніцтва** – насаджэнне ў Заходняй Беларусі польскіх вайсковых і цывільных каланістаў – асаднікаў, якія атрымлівалі надзелы на ільготных умовах, або бясплатна і доўгатэрміновыя крэдыты на абзавядзенне гаспадаркай.

**Асветніцтва** – 1) эпоха ў развіцці еўрапейскай культуры перыяду станаўлення капіталізму (XVII – XVIII стст.); 2) ідэйны накірунак, які зарадзіўся ў Англіі і Францыіі і быў заснаваны на прынцыпах рацыяналізму і вальнадумства – ўпэўненасці ў рашаючай ролі розуму і навукі ў пазнанні свету. Выступаў супраць феадальна-абсалютысцкага рэжыму, за палітычную свабоду, грамадзянскую роўнасць. На Беларусі ідэі распаўсюдзіліся ў XVIII ст. і выкарыстоўваліся для выпрацоўкі палітычных і культурных праектаў.

**Аўтарытарна-таталітарны** рэжым – палітычны рэжым канца 20-х – першай паловы 50-х гг. XX ст. у СССР. Адметная рыса таталітарнага рэжыму (ад лац. totalis – поўны) – жорсткі дзяржаўны кантроль над усімі сферамі жыцця грамадства. Аўтарытарны палітычны рэжым (ад лат. auctoritas – улада, уплыў)

утрымоўвае элементы асабістай дыктатуры, для яго характэрны: адданасць аўтарытэту, апора на ваенна-карны апарат, сістэматычныя парушэнні канстытуцыі. Аўтарытарна-таталітарны рэжым ў СССР характарызаваўся ўстанаўленнем асабістай дыктатуры і культу асобы І.В. Сталіна, зрошчваннем партыйнага і дзяржаўнага апарату кіравання, пераўтварэннем палітычнай партыі – Усесаюзнай камуністычнай партыі (бальшавікоў) (з 1952 г. – Камуністычнай партыі Савецкага Саюза) – у масавую структуру; наяўнасцю іншых масавых дзяржаўных арганізацый (прафсаюзы, камсамол і інш.).

**Балты** – група індаеўрапейскіх плямёнаў і народаў, якія размаўлялі на балцкіх мовах або іх дыялектах. Тэрмін у 1845 г. увёў нямецкі вучоны Г.Ф. Несельман, які падзяліў балтаў на тры группы: заходнія (прусы, ятвягі, куршы, галінды, скальвы); дняпроўскія (голядзь); усходнія (літва, аўкшайты, жэмайты, латгалы, земгалы і інш.).

**Брэсцкі мір** (Брэст-Літоўскі) – сепаратны мірны дагавор ад 3 сакавіка 1918 г. падпісаны Савецкай Расіяй з аднаго боку і Германіяй, Балгарыяй і Аўстра-Венгрыяй – з другога. Завяршыў Першую сусветную вайну на Усходнім фронце.

**Буржуазная рэвалюцыя** – тып сацыяльнай рэвалюцыі, якая аб'ектыўна накіравана на ліквідацыю феадалізму і ўсталяванне палітычнай улады буржуазіі, стварэнне ўмоў для развіцця капіталізму. Не мяняючы карэнным чынам прыватнага характару ўласнасці на сродкі вытворчасці, буржуазная рэвалюцыя здымае з яе абмежаванні і надае першаступеннае значэнне фінансаваму і прамысловаму капіталу. На гэтай аснове ствараецца новы тып рынку – капіталістычны. Новая сацыяльная сіла, што прыходзіць да ўлады ў выніку буржуазнай рэвалюцыі, кардынальна мяняе форму дзяржаўнага ладу: на змену абсалютысцкай манархіі прыходзіць абмежаваная (канстытуцыйная) манархія, або рэспубліка. Першай пераможнай буржуазнай рэвалюцыяй была Нідэрландская (1566 – 1609), другой – Англійская (1640 – 1688).

**Вотчынная мануфактура** – прадпрыемства мануфактурнага тыпу, якое абслугоўвалася прымусовай працай прыгонных сялян, выкарыстоўвала рамесную тэхніку і было заснавана на кааперацыі і тэхнічным падзеле працы.

**Вытвараючая (вытворчая) гаспадарка** – тып гаспадарання, які забяспечвае патрэбы жыхароў дзякуючы такім заняткам, як земляробства і жывёлагадоўля, прыйшла на змену прысвойваючай гаспадарцы.

**"Вялікае перасяленне народаў"(ВПН)** – міграцыя ў эпоху бронзавага веку плямёнаў жывёлаводаў-вандраўнікоў з паўвострава Малая Азія на тэрыторыю Еўропы і Іранскае нагор'е, у працэсе якой с адзінай індаеўрапейскай супольнасці вылучыліся германскія, балцкія, славянскія плямёны і іранамоўныя народы. На другой хвалі ВПН ў III-IV стст. н. э. германскія плямёны рассяляліся на тырыторыі Рымскай імперыі, у выніку чаго з'явіўся шэраг

варварскіх дзяржаў і загінула Заходне-Рымская імперыя. Трэцяя хваля ВПН – перасяленне славян на тэрыторыю Усходне-Еўрапейскай раўніны ў V-VI стст. і іх з'яўленне на тэрыторыі сучаснай Беларусі.

**Генацыд** (ад грэч. γένος – род, племя і лац. caedo – "забіваю") – дзеянні, накіраваныя на поўнае або частковае фізічнае знішчэнне групы людзей на падставе палітычных, расавых, рылігійных, нацыянальных альбо іншых крытэрыяў. З 1948 г. кваліфікавана як міжнароднае злачынства супраць чалавецтва.

**Генерал-губернатарства** – адміністрацыйна-тэрытарыяльная адзінка ў Расійскай імперыі з 1775 г. Беларускія этнічныя землі з 1802 г. ўваходзілі ў склад Беларускага і Літоўскага генерал-губернатарстваў.

**Гісторыя** (ад грэч. historia – апавяданне аб мінулым, аб тым, што высветлена, даследавана) – навука, якая вызначае і тлумачыць канкрэтны ход і заканамернасці развіцця чалавечага грамадства для разумення сучаснасці і перспектыў будучага.

**Гуманізм** (ад лац. humanus – "чалавечны") – прагрэсіўны светапогляд эпохі Адраджэння, накіраваны на вызваленне асобы чалавека ад ідэйнага застою феадалізму і каталіцызму. Аснову складалі тры прынцыпы: самастойнасць чалавека, абсалютная духоўная незалежнасць, натуралізм.

**"Другое выданне прыгонніцтва"** – стварэнне ў Вялікім княстве Літоўскім і Каралеўстве Польскім фальварачна-паншчыннай сістэмы гаспадаркі, асновай якой быў фальварак (двор і гаспадарка феадала, заснаваная на працы прыгонных сялян і арыентаваная на продаж сельскагаспадарчай прадукцыі), якое прывяло ў XV – XVI стст. да ўзмацнення прыгоннай залежнасці сялян, юрыдычнага афармлення прыгоннага права у той час, калі ў Заходняй Еўропе афармляліся капіталістычныя адносіны і залежнае сялянства атрымлівала буржуазныя свабоды. Тэрмін уведзены Ф. Энгельсам.

**Дрыгавічы** – адно з усходнеславянскіх племянных аб'яднанняў, якое ўтварылася ў выніку асіміляцыі славянамі мясцовых балцкіх плямёнаў. Рассялялася на ўсходзе да Дняпра, на поўначы да Барысава, Лагойска, Заслаў'я, вярхоўяў Нёмана; на поўдні мяжа рассялення дрыгавічоў пераходзіла за Прыпяць, на захадзе – за Заходні Буг. Верагоднае пахожанне назвы ад слова «дрыгва» (балота).

**Дысідэнт** (ад лац. dissidens – "не згаджацца") – іншадумца, чалавек, які не згаджаецца, або адступае ад дагматаў пануючай у дзяржаве рэлігійнай ідэалогіі. У Рэчы Паспалітай дысідэнт – гэта некаталік, у тым ліку – праваслаўны. У СССР – той, хто не падтрымлівае афіцыйную савецкую ідэалогію.

**Дэкларацыя правоў народаў Расіі** – адзін з першых заканадаўчых актаў бальшавіцкага ўрада РСФСР ад 2(15) лістапада 1917 г., які даваў права "на свабоднае самавызначэнне ажно да аддзялення і ўтварэння самастойнай дзяржавы" народам былой Расійскай імперыі.

**Дэмакратызацыя** (калька ад англ. Democratization, ад стараж.-грэч. δημοκρατία – "улада народа") – працэс укаранення дэмакратычных прынцыпаў у палітычную сістэму, культуру, стыль жыцця і г. д. У час палітычных рэформаў канца 1980-х – пачатку 1990-х гг. у СССР праявілася ўвядзеннем шматпартыйнасці, плюралізму.

**ЕўрАзЭС** (Еўразійскае эканамічнае супольніцтва) – міжнародная эканамічная арганізацыя, ўзнікла 10 кастрычніка 2000 г. Функцыі: 1) фармаванне агульных мытных граніц паміж Беларуссю, Казахстанам, Кіргізіяй, Расіяй, Таджыкістанам, Узбекістанам; 2) выпрацоўка адзіных падыходаў да знешняй палітыкі, тарыфаў, цэнаў і іншых складаючых функцыянавання агульнага рынку ("Адзінай эканамічнай прасторы"). У жніўні 2006 г. на савеце ЕўрАзЭС створаны Мытны саюз Беларусі, Расіі, Казахстана.

**"Жалезная заслона"** (выраз У. Чэрчыля) – сістэма мер палітычнай і інфармацыйнай ізаляцыі, якая перашкаджала камунікацыям паміж канфрантуючымі блокамі сацыялістычных і капіталістычных дзяржаў у час халоднай вайны. Сімвалам падзення жалезнай заслоны стала Бярлінская сцяна (узведзеная ў 1961 г. паміж ФРГ і сацыялістычнай ГДР і разбураная ў 1989 г).

**"Жнівеньскі путч"** – дзяржаўны пераварот з удзелам невялікай групы загаворшчыкаў самаабвешчанага Дзяржаўнага камітэта па надзвычайнаму становішчу (так зв. "ГКЧП") 19 – 21 жніўня 1991 г. у Маскве (СССР). Яго мэта – недапушчэнне падпісання новага саюзнага дагавора савецкіх рэспублік, спыненне гарбачоўскай перабудовы. Удзельнікі путчу былі арыштаваны.

**Земская рэформа 1864** г. – буржуазная па зместу рэформа па увядзенню мясцовага кіравання гаспадаркай, народнай асветай, медыцынскім абслугоўваннем і іншымі сферамі грамадска-культурнага жыцця ў Расійскай імперыі, калі ўтвараліся выбарныя земскія ўстановы – губернскія і павятовыя сходы і ўправы. У беларускіх губернях праведзена толькі ў 1911 г.

**Імперыялізм** (ад лац. imperium – «улада», «панаванне») – 1) сістэма прамога ці ўскоснага палітыка-эканамічнага панавання над насельніцтвам і тэрыторыяй чужых краін; 2) палітыка асобных эканамічна развітых дзяржаў, якая ажыццяўляецца рознымі сродкамі (палітычнымі, эканамічнымі, культурнымі, ідэалагічнымі) у адносінах да слабаразвітых краін "трэццяга свету". Паняцце "імперыялізм" выкарыстоўваецца для абазначэння экспансіяніcцкай палітыкі вялікіх еўрапейскіх дзяржаў Вялікабрытаніі, Францыі, Расіі, Германіі, а з 1870-х гг. да Першай сусветнай вайны і ЗША і Японіі.

**Індустрыялізацыя** – 1) працэс пераўтварэння аграрных краін у індустрыяльныя на базе буйной машыннай вытворчасці; 2) сацыялістычная індустрыялізацыя – эканамічная палітыка Камуністычнай партыі і савецкага ўрада ў 1920-1930-я гг., якая мела на мэце стварыць матэрыяльна-тэхнічную базу сацыялізму, заснаваць дзяржаву з магутным эканоміка-вытворчым, навукова-тэхнічным і абарончым патэнцыялам, забяспечыць рост прадукцыйнасці працы, няўхільнае павышэнне дабрабыту працоўных.

**Інтэнсіўны шлях развіцця** – рост вытворчасці на аснове паляпшэння якасных паказчыкаў, перш за ўсё, за кошт укаранення у вытворчасць дасягненняў навукі і тэхнікі і павышэння прадукцыйнасці працы. Сучасная форма інтэнсіўнага развіцця эканомікі – інавацыйны шлях.

**Калабарацыянізм** (ад франц. collobоration – "супрацоўніцтва") – добраахвотнае супрацоўніцтва з ворагам (акупантам) у яго інтарэсах, якое трактуецца як дзяржаўная здрада. У час ВАВ на акупіраваных тэрыторях БССР сярод калабарантаў налічвалася каля 80 – 100 тыс. чалавек. Сярод іх у асноўным былі асобы, якія працавалі ў створаных акупантамі адміністрацыйных органах, грамадскіх і ваенных арганізацыях (Беларускай народнай самапомачы, Беларускім корпусе самааховы, Беларускай Краёвай Абароне, Саюзе беларускай моладзі і Беларускай Цэнтральнай радзе), а таксама асобы, якія з'яўляліся дапаможнымі супрацоўнікамі нямецкіх акупацыйных органаў гарадскога, абласнога і рэспубліканскага звяна.

**Калектывізацыя** – вытворчае каапераванне сялянскіх гаспадарак, якое заключалася ў масавым пераводзе аднаасобных сялянскіх гаспадарак з індывідуальнай сістэмы гаспадарання на калектыўную ў час сацыялістычных пераўтварэнняў ў сельскай гаспадарцы з другой паловы 1920-х гг. XV з'езд УКП(б) у снежні 1927 г. прыняў курс на правядзенне суцэльнай калектывізацыі, якая у БССР з 1928 г. праводзілася прымусовымі метадамі. У Заходняй Беларусі, якая ўз'ядналася з БССР у 1939 г., праводзілася напярэдадні і пасля завяршэння Вялікай Айчыннай вайны.

**Камандна-адміністрацыйная сістэма** (КАС) – мадель планавай дзяржаўнай эканомікі савецкага перыяду, прыкметы якой: адміністрацыйныя метады кіравання; звышжорсткая цэнтралізацыя сістэмы вытворчасці і размеркавання матэрыяльных рэсурсаў; характэрны для даіндустрыяльнай цывілізацыі пазаэканамічны прымус, які ажыццяўляўся на грунце феадальных, рабаўладальніцкіх і надзвычайных метадаў; манапольная ўласнасць камуністычнай і дзяржаўнай наменклатуры на сродкі вытворчасці, на канчатковы выпрабляемы прадукт, адчужэнне непасрэдных вытворцаў ад уласнасці; слабая ўспрымальнасць да навукова-тэхнічнага прагрэсу; пераважна экстэнсіўны тып эканамічнага развіцця; ураўняльны прынцып выплаты заработнай платы, размеркавання вынікаў працы ў спалучэнні з сістэмай прывілеяў.

**Камасацыя** – адно з мерапрыемстваў польскай аграрнай рэформы (праводзілася з 1925 г.), звядзенне ў адзіны ўчастак палосак надзельнай зямлі – ліквідацыя цераспалосіцы, хутарызацыя. Да 1939 г. на хутары было расселена каля 43 % сялянскіх гаспадарак у Заходняй Беларусі.

**Капіталізм** – грамадска-эканамічная фармацыя, заснаваная на прыватнай уласнасці на сродкі вытворчасці і эксплуатацыі наёмнай працы капіталам. Асноўныя рысы капіталізму: панаванне таварна-грашовых адносін і прыватнай уласнасці на сродкі вытворчасці; наяўнасць развітога грамадскага падзелу працы; рост аграмаджэння вытворчасці; ператварэнне рабочай сілы ў тавар; эксплуатацыя наёмных рабочых капіталістамі. Капіталізм вызначаецца панаваннем эканамічнага прымусу, у адрозненне ад форм пазаэканамічнага прымусу, уласцівых для феадалізма і рабаўладальніцтва.

**Карэнізацыя** – вылучэнне кадраў на кіруючыя пасады з прадстаўнікоў карэннага насельніцтва БССР, адзін з цэнральных кірункаў палітыкі беларусізацыі ў 1920-я гг.

**Крывічы** – адно з усходнеславянскіх племянных аб'яднанняў, вынік асіміляцыі славянамі мясцовых балтцкіх і заходне-фінскіх плямёнаў. Рассялялася ў басейне рэк Заходняя Дзвіна і вярхоў'яў Дняпра, Волгі, на поўдні Чудскага возера. Магчымае паходжанне назвы – ад слоў "родныя па крыві", "кроўныя".

**"Ліберум вета"** (ад лац. Liberum veto – "свабодна забараняю") – адно з праў так званых "залатых шляхецкіх вольнасцяў", якое дазваляла дэпутату Сойма нават адным голасам "супраць" перашкодзіць прыняццю законапраекта. Сведчыла аб бязладдзі ў Рэчы Паспалітай у канцы XVII – XVIII стст.

**Лівонская вайна** – вайна Маскоўскага княства за выхад да Балтыйскага мора з Лівоніяй (саюзнікам Вялікага княства Літоўскага) ў 1558 – 1583 гг., адна з прычын падпісання Люблінскай уніі паміж ВКЛ і Каралеўствам Польшча.

**Лінія Керзана** – часовая беларуска-польская граніца па лініі Гродна – Ялаўка – Няміраў – Брэст-Літоўск. Увайшла ў гісторыю з ліпеня 1920 г., калі міністр ваенных спраў Вялікабрытаніі лорд Дж. Керзан ад імя Вярхоўнага Савета Антанты патрабаваў спыніць наступленне Чырвонай Арміі ў час польска-савецкай вайны.

**Ляднае (або падсечна-агнявое) земляробства** – адна з прымітыўных старажытных сістэм земляробства лясной зоны, калі на месцы высечанага і спаленага лесу глебу апрацоўвалі бараной-сукаваткай, а попел ужывалі ў якасці ўгнаення.

**Магдэбургскае права** – феадальнае гарадское права на самакіраванне. Упершыню ўзнікла ў XIII ст. у нямецкім г. Магдэбурге (1188). У Вялікім княстве Літоўскім першымі гэта права атрымалі Вільня (1387) і Бярэсце (1390).

**Манаполія** (ад грэч. – monos – «адзін» і poleo – «прадай») – 1) выключнае права адной асобы ці групы асоб на што-небудзь, напрыклад, на зямлю, вытворчасць чаго-небудзь, гандаль вызначанымі таварамі, знешні гандаль; 2) капіталістычныя манаполіі (картэлі сіндыкаты, трэсты, канцэрны) – буйныя кампаніі, саюзы, пагадненні, альбо аб'яднанні капіталістаў, якія ўзнікаюць на падставе высокага ўзроўню канцэнтрацыі вытворчасці і капіталу з мэтай пераадолення канкурэнцыі і атрымання звышпрыбыткаў. Манаполіі ў Беларусі ўзнікли на мяжы XIX – XX стст.

**Мануфактура** (ад лац. manus – «рука» і faktura – «выраб») – форма арганізацыі вытворчасці, заснаваная на выкарыстанні наёмнай працы і падзеле тэхналагічнага працэсу на шэраг асобных аперацый, прадпрыемства, заснаванае на ручной працы, пераходная форма ад рамеснай вытворчасці да фабрыкі (гл. вышэй "Вотчынная мануфактура"). Першымі на Беларусі з 10-30 гг. XVIII ст. ўзніклі Налібоцкая і Урэцкая шкляныя мануфактуры. Шырокую вядомасць набылі Слуцкая і Нясвіжская мануфактуры шаўковых паясоў.

**МТС** (машынна-трактарная станцыя) – дзяржаўнае сельскагаспадарчае прадпрыемства ў СССР, якое забяспечвала тэхнічную і арганізацыйную дапамогу калгасам за натуральную плату. У МТС былі сканцэнтраваны важнейшыя сродкі вытворчасці і кваліфікаваныя кадры. З пачатку 1933 г. улада ў вёсцы фактычна перайшла да надзвычайных органаў – палітаддзелаў МТС, якія праіснавалі да канца 1934 г. Першая МТС ў БССР ўзнікла ў 1929 г. у Койданаўскім (цяпер Дзяржынскім) раёне. У 1958 г. МТС былі расфармаваны.

**Натуральная гаспадарка** – феадальная гаспадарка, у якой выраблялася ўсё неабходнае для жыцця і ўжывалася амаль усё, што выраблялася. Прадукцыя не прызначалася для абмену або продажу (акрамя солі і жалеза).

**Нацыя** – сацыяльна-эканамічная, палітычная і духоўная супольнасць людзей з пэўнай псіхалогіяй і самасвядомасцю, якая мае агульную мову, адметную культуру, побыт і тэрыторыю сталага пражывання.

**Неалітычная рэвалюцыя** – пераход ад эпохі першабытнасці да эпохі першых цывілізацый. Тэрмін уведзены ў 1925 г. Г. Чайлдам. Тэрмін сімвалізуе рэзкія перамены ва ўзаемаадносінах чалавека і прыроды: 1) пераход ад прысвойваючай да вытвараючай формы гаспадаркі; 2) грамадскі падзел працы ў трох формах; 3) вертыкальную дыферэнцыяцыю сваяцкай абшчыны.

**“Новае палітычнае мышленне”** – новая канцэпцыя міжнароднай палітыкі ў час перабудовы, прапанаваная Генеральным сакратаром ЦК КПСС М.С. Гарбачовым, пабудаваная на прыярытэце агульначалавечых каштоўнасцяў, прынцыпах дэідэалагізацыі міжнародных адносін, раззбраення, адмовы ад вырашэння праблем з выкарыстаннем сілы і іншых. Садзейнічала заканчэнню халоднай вайны.

**Нясвіжскі фарны касцёл** – або Касцёл Цела Гасподня (Фарны) у Нясвіжы – архітэктурны помнік ранняга барокка, першы храм у гэтым стыле на беларускіх землях, першы езуіцкі касцел на тэрыторыі Рэчы Паспалітай, дзе знаходзіцца радавы магільны склеп князёў Радзівілаў. Пабудаваны па праекце італьянскага архітэктара Джавані Бернардоні у 1584-1593 гг. Называюць фарным, бо падобна аднаму з сямі дзівосаў свету – старажытнаму маяку на в. Фарос – паказвае шлях людзям да Бога.

**Палітычная мадэрнізацыя** – гэта пераход традыцыйнага грамадства да сучасных мадэляў палітычнай сістэмы. Мадэрнізацыя (ад англ. modern – «абноўлены», «сучасны», «удасканалены») як макрагістарычны працэс тлумачыцца: 1) у Новы час як – пераход ад традыцыйнага грамадства да індустрыяльнага; 2) у нашы дні – як пастаянны працэс эвалюцыйнага развіцця з дапамогай рэформаў і інавацый, пераход да постіндустрыяльнага грамадства. Мадэрнізацыя як агульны працэс пачынаецца з адаптацыі палітычнай сістэмы да сучасных умоў (напрыклад, у час гарбачоўскай перабудовы праявілася ў дэмакратызацыі, змяненні ідэалагічнай канцэпцыі).

**Партызанская зона** – тэрыторыі на акупаванай частцы СССР у час Вялікай Айчыннай вайны, якія кантраляваліся партызанамі. Па сведках Беларускага штаба партызанскага руху, да пачатку 1943 г. у Беларусі партызаны кантралявалі каля 50 тыс. кв. км, налічвалася больш 20 вялікіх партызанскіх зон: Барысаўска-Бегомльская, Клічэўская, Кастрычніцка-Любанская, Полацка-Лепельская і інш.

**Паўночнае Адраджэнне** – культура Рэнесанса (ад фр. Renaissance, італ. Rinascimento – “зноў”, “нанова народжаны”) XV-XVI стст. па за межамі Італіі, на поўнач ад Альпаў; еўрапейскае Адраджэнне, куды сярод іншых уключаны рэгіён Усходняй Еўропы – Вялікае княства Літоўскае. Адметныя прыкметы – кампраміс з сярэднявечнымі традыцыямі, сувязь з рэлігійнымі і нацыянальна-культурнымі рухамі.

**Перабудова** – прыняты ў 1985 г. кіраўніцтвам КПСС на чале з яе генеральным сакратаром М.С. Гарбачовым курс на рэфармаванне сацыяльна-эканамічнай і палітычнай сістэмы ў СССР, “удасканаленне сацыялізму”, “расрыццё патэнцыялу сацыялізму”. Прывяла да радыкальных эканамічных

рэформаў у спалучэнні з дэмакратызацыяй грамадска-палітычнага жыцця. Кардынальныя палытычныя змяненні пачаліся ў студзені 1987 г., калі на пленуме ЦК КПСС перабудова была аб'яўлена дзяржаўнай ідэалогіяй.

**Першабытнае грамадства** – грамадска-эканамічная фармацыя, якая ахоплівае перыяд ад з'яўлення першых людзей да ўзнікнення класавага грамадства. Паводле археалагічнай перыядызацыі супадае з каменным векам. Для першабытнаабшчыннага ладу характэрны: паступовая біялагічная эвалюцыя чалавека, узаемаабумоўленасць абшчынных, родаасных і эканамічных сувязей паміж людзьмі, калектыўная ўласнасць на сродкі вытворчасці, ураўняльнае размеркаванне сродкаў існавання. Вытворчыя адносіны, характэрныя для першабытнаабшчыннага ладу, захоўваліся на тэрыторыі Беларусі ў бронзавым і нават у жалезным веку.

**Першае і другое ўзбуйненне БССР** – вяртанне ў склад БССР тэрыторый з большасцю беларускага насельніцтва. У сакавіку 1924 г. было перададзена 15 паветаў і некалькі валасцей Віцебскай, Гомельскай і Смаленскай губерняў; ў снежні 1926 г. – Рэчыцкі і Гомельскі паветы Гомельскай губерніі.

**План Агінскага** – праект утварэння дзяржавы – Вялікага княства Літоўскага як асобнай правінцыі на тэрыторыі 8 губерняў Расійскай імперыі, складзены ў 1811 г. пад кіраўніцтвам сенатара, князя Міхала Клеафаса Агінскага. З дапамогай плана імператар Аляксандр I жадаў напярэдадні вайны з Напалеонам нейтралізаваць прафранцузскія настроі. План застаўся нерэалізаваным, паколькі сепаратызм выклікаў незадавальненне у расійскім грамадстве.

**Полацкая унія 1839 г.** – Полацкі царкоўны сабор іерархаў уніяцкай царквы ў Беларусі і Украіне, які прыняў рашэнне аб абавязковым далучэнні прадстаўнікоў грэка-каталіцкай царквы (уніятцтва) да Рускай Праваслаўнай Царквы. Ліквідацыя уніяцкай царквы стала адной з праяў палітыкі русіфікацыі на беларускіх землях.

**Прамысловы пераварот** – гэта сукупнасць эканамічных, сацыяльных і палітычных зрухаў, азнаменаваўшых пераход ад мануфактурнай стадыі капіталізму да фабрычнай сістэмы вытворчасці, заснаванай на машыннай тэхніцы. У выніку гэтых зрухаў капіталістычны спосаб вытворчасці атрымаў адпавядаючы яго характару тэхнічны базіс і зацвердзіўся як фармацыя.

**Пратэстантызм** – агульная назва хрысціянскіх плыняў і кірункаў, што ўзніклі пад уплывам Рэфармацыі – грамадска-рэлігійнага руху ў XVI ст. супраць узмацнення пазіцый каталіцкай царквы. У яго аснове вучэнне аб непасрэднай сувязі чалавека з Богам без пасрэдніцтва царквы. У Беларусі з пратэстанцкіх плыняў былі распаўсюджаны кальвінізм, лютэранства, антытрынетарызм.

**Прыватызацыя** – перадача аб'ектаў гаспадарання з дзяржаўнай уласнасці ў прыватную або калектыўную.

**Прысвойваючая (або спажывецкая) гаспадарка** – тып гаспадарання эпохі палеаліту, мезаліту і ранняга неаліту, аснову якога складалі збіральніцтва, паляўнічы промысел і рыбалоўства.

**Прышчэпаўшчына** – абвінавачванне партыўным кіраўніцтвам КП(б)Б ў нацыянал-дэмакратызме, так званым "правым ўхіле" у партыі і дзяржаве, контррэвалюцыйнай антыкалгаснай дзейнасці ў галіне сельскай гаспадаркі. Народны камісар земляробства БССР з 1921 да 1929 г. Дз.Ф. Прышчэпаў склаў "Пяцігадовы перспектыўны план развіцця лясной і сельскай гаспадаркі БССР на 1925–1929 гады", які прадугледжваў стварэнне хутароў і дробных пасёлкаў па тыпу водрубаў. У выніку да канца 1920-х гг. аднаасобнае землекарыстанне (двары, хутары і водрубы) на Беларусі складала больш за 25 % сялянскага землекарыстання. У той жа час ў гады НЭПа ў рэспубліцы ўмацавалася сельскагаспадарчая кааперацыя. Хаця да 1927 г. у Беларусі ў асноўным захоўвалася свабода выбару землекарыстання, Зямельны кодэкс БССР 1925 г. ужо абмяжоўваў развіццё хутароў і водрубаў, вызначаў адрэзкі зямель у тых, хто меў яе звыш нормы, рэкамендаваў калектыўныя формы землекарыстання. Дз.Ф. Прышчэпаў быў зняты з пасады наркама земляробства БССР і ў 1930 г. арыштаваны па сфабрыкаванай справе "Саюза вызвалення Беларусі".

**"Разбор шляхты"** – комплекс мерапрыемстваў царскага урада па верыфікацыі і скарачэнні шляхецтва пасля ўваходжання беларускіх зямель Рэчы Паспалітай у Расійскую імперыю. Паводле закону "Аб разборы шляхты ў заходніх губернях і аб уладкаванні гэтага роду людзей" (1831), тыя прадстаўнікі шляхты, якія ў пэўны тэрмін не прадставілі дакументаў, якія пацвярджалі іх дваранскае паходжанне, пераводзіліся ў саслоўе дзяржаўных сялян або мяшчан.

**Рэабілітацыя** (ад лат. rehabilitate - аднаўленне) – аднаўленне ў правах, аднаўленне згубленага добрага імя рэпрэсаваных, адмена неабгрунтаванага абвінавачвання.

**Санацыя** (ад лац. sanatio – "аздараўленне", "лекаванне") – рэакцыйны палітычны і эканамічны рэжым, які быў уведзены польскім урадам пад кіраўніцтвам Юзефа Пілсудскага на тэрыторыі Заходняй Беларусі з 1926 г. з мэтай перашкодзіць распаўсюджванню камуністычнай ідэалогіі.

**Сацыяльна-арыентаваная рыначная эканоміка** – эканамічная мадэль, якая спалучае перавагі рыначнай канкурэнцыі і эфектыўнай сістэмы абароны інтарэсаў, ідэі рыначнага самарэгулявання і дзяржаўнага кіравання.

**Сацыяльна-эканамічная фармацыя** (або грамадска-эканамічная фармацыя) (ад лац. formatio – утварэнне, від) – гэта стадыя грамадскай эвалюцыі, ступень развіцця вытворчых сіл грамадства і адпаведны ёй гістарычны тып эканамічных адносін, спосаб вытворчасці. У адпаведнасці з фармацыйным падыходам да разгляду гістарычнага працэсу, які быў выкладзены нямецкім вучоным Карлам Марксам ў даследаванні "Капітал", вылучаецца 5 асноўных фармацый – першабытная, рабаўладальніцкая, феадальная, капіталістычная, камуністычная.

**"СВБ"** ("Саюз вызвалення Беларусі") – сфабрыкаваная органамі ДПУ БССР справа нацыяналістычнай контррэвалюцыйнай, антысавецкай арганізацыі, на падставе якой ў 1930 –1931 гг. былі арыштаваны 108 палітычных і культурных дзеячаў БССР (Я. Купала, У. Ігнатоўскі, Я. Колас, Д. Жылуновіч, В. Ластоўскі, А. Баліцкі, Д. Прышчэпаў і інш.). З іх рэпрысаваны 90 чалавек (89 беларусаў, 1 рускі). Справа "СВБ" азначала паварот палітычнага курсу ў СССР, згортванне тагачаснай нацыянальнай палітыкі. У чэрвені 1988 г. судзебная калегія Вярхоўнага суда БССР адмяніла пастанову калегіі АДПУ у сувязі з адсутнасцю складу злачынства.

**Смутны час** – перыяд гісторыі Расіі які характарызуецца палітычным і сацыяльна-эканамічным крызісам, інтэрвенцыяй Рэчы Паспалітай, стыхійнымі бедствамі. Пачынаецца ў 1598 г., калі памірае цар Фёдар І Іванавіч. (Малодшы сын Івана IV – царэвіч Дзмітрый – апошні прадстаўнік старажытнарускай дынастыі Рурыкавічаў загінуў яшчэ ў 1591 г.). У перыяд баярскага праўлення Барыса Гадунова (1598 – 1605) і Васіля Шуйскага (1606 – 1610) кароль польскі і вялікі князь літоўскі Жыгімонт Ваза спачатку спрабаваў ажыццявіць інкарпарацыю рускіх зямель у Рэч Паспалітую з дапамогай сваіх стаўленнікаў – Рыгора Атрэпьева і Міхаіла Малчанава (так званыхІлджэдзмітрыя І іІлджэдзмітрыя II), а затым, з 1609 г. пачаў захопніцкую вайну. Семібаяршчына – праўленне яго сына Уладзіслава ў Маскве (1610–1612) была звергнута народным апалчэннем на чале з ніжэгародскім земскім старастай Кузьмой Мініным і князем Дзмітрыем Пажарскім. Смутны час завяршыўся выбраннем на русскі трон на Земскім саборы 1613 г. Міхаіла Раманава.

**СНД** (Садружнасць Незалежных Дзяржаў) – міжнародная арганізацыя канфедэратыўнага тыпу, якая існуе з 8 снежня 1991 г. і складаецца з рэспублік былога СССР (Азербайджан, Арменія, Беларусь, Казахстан, Кіргізія, Малдова, Расія, Таджыкістан, Туркменістан, Узбекістан, Украіна, Грузія (да 2008 г.)). У 2013–2014 гг. старшынёй Савета глаў дзяржаў СНД быў Лукашэнка А.Р., у 2015 г. – Мясніковіч М.У (Беларусь).

**Стаханаўскі рух** – новы этап сацыялістычнага спаборніцтва ў час 2-й пяцігодкі індустрыялізацыі ў СССР, накіраваны на рацыяналізацыю працы, перавыкананне ўстаноўленых нормаў вытворчасці, планавых паказчыкаў. Назва паходзіць ад імя шахцера Аляксея Стаханава, які ў 1935 г. за смену здабыў вугля ў 14 разоў звыш нормы.

**ТБШ** (Таварыства Беларускай Школы) – культурна-асветная арганізацыя ў Заходняй Беларусі (1921–1936), якая імкнулася распаўсюджваць асвету сярод беларусаў, пашыраць беларускія школы. Сярод яе кіраўнікоў – Браніслаў Тарашкевіч, Радаслаў Астроўскі і інш.

**Тэўтонскі ордэн** (ат лац. teutonicus – "германскі") – германскі духоўна-рыцарскі ордэн, заснаваны ў канцы XII ст. у час 3-га крыжовага паходу ў Палясціну. У сувязі з няўдаласцю заваявання Усходняга Міжземнамор'я місіянерская дзейнасць ордэна была перанесена ва Усходнюю Еўропу. Тэўтонцы пачалі барацьбу з прускімі язычнікамі ў Польшчы. У 1237 г. яны аб'ядналіся з Ордэнам Мечаносцаў, пад уладу Тэўтонскага ордэна трапілі Прусія, Лівонія. Полацкая дружына прымала ўдзел у разгроме тэўтонцаў у Неўскай бітве (1240). Дзяржавы-саюзніцы Каралеўства Польшча і Вялікае княства Літоўскае канчаткова разграмілі Тэўтонскі ордэн у Грунвальдскай бітве (1410).

**Унія** (ад лац. Unio – "саюз", "адзінства") – дынастычны і палітычны саюз, аб'яднанне дзяржаў (цэркваў) на чале з адзіным кіраўніком. Вядомыя прыклады: Крэўская унія 1385 г. – пагадненне паміж Каралеўствам Польшча і Вялікім княствам Літоўскім, калі вялікі князь ВКЛ Ягайла адначасова быў каранаваны; Берасцейская царкоўная унія 1596 г. – аб'яднанне праваслаўнай і каталіцкай цэркваў пад уладай папы Рымскага.

**Фальварак** – (ад польск. folwark і ад ням. vorwerk – "хутар") – від феадальнага зямельнага ўладання ў ВКЛ і Рэчы Паспалітай: двор феадала з комплексам будынкаў і ўгоддзяў, вытворчасць сельскагаспадарчай прадукцыі ў якім скіравана на продаж. З мэтаю павышэння прыбытку ад зямель уся зямля ў дзяржаўных маёнтках у час аграрнай рэформы 1557 г. дзялілася на валокі, лепшыя з якіх адводзіліся пад вялікакняжацкія гаспадаркі.

**Феадалізм** (ад лац. Feodum – "уладанне") – грамадска-эканамічная фармацыя, якая прыходзіць на змену рабаўладальніцкаму ці першабытнаабшчыннаму ладу і папярэднічае капіталізму. Асноўная эканамічная сутнасць феадалізму – прысваенне феадаламі дадатковага прадукту шляхам эксплуатацыі сялян на аснове манапольнай уласнасці на зямлю і няпоўнай уласнасці на непасрэдных вытворцаў. Феадальная гаспадарка заснавана на спалучэнні буйной зямельнай уласнасці феадалаў з дробнай індывідуальнай гаспадаркай непасрэдных вытворцаў – сялян.

**Феадальная рэнта** – эканамічная форма рэалізацыі ўласнасці феадала на зямлю і сродак пазаэканамічнага прымусу. Гэта частка дадатковага прадукту залежных сялян, якая прысвойваецца землеўладальнікам у трох формах: адпрацовачная (паншчына), прадуктовая (натуральны аброк), грашовая (на Беларусі называлася чыншам).

**"Халодная вайна"** – супрацьстаянне двух блокаў дзяржаў з цэнтрамі ў ЗША і СССР, заснаваных на розных эканамічных, палітычных і ідэалагічных сістэмах, якія валодалі ядзернай здброяй з 1946 г. (па некаторых думках) да 1991 г.

**Харчпадатак** – харчовы падатак, быў уведзены у РСФСР і БССР у 1921 г. замест харчовай развёрсткі. Абвяшчаўся загадзя, збіраўся ў натуральным выглядзе, азнаменаваў пачатак новай эканамічнай палітыкі. Існаваў да ўвядзення адзінага сельскагаспадарчага падатку ў 1923 г.

**Хрысціянства** – адна з трох сусветных рэлігій, заснаваная на веры ў Бога Ісуса Хрыста. Хрысціянства было прынята ў Кіеўскай Русі ў 988 г. у візантыйскай (праваслаўнай) форме. Раскол хрысціянства на каталіцтва і праваслаўе адбыўся ў 1054 г. Гісторыя Беларускай Праваслаўнай Царквы адлічваецца з моманту заснавання Полацкай епархіі – царкоўна-тэрытарыяльнай адзінкі (992 г.). У сучаснай Беларусі распаўсюджаны ўсе напрамкі хрысціянства: праваслаўе, каталіцызм, пратэстантызм, уніяцтва.

**Цывілізацыя** – устойлівая супольнасць людзей, аб'яднаных духоўнымі, перш за усё рэлігійнымі, традыцыямі, аднолькавым вобразам жыцця, геаграфічнымі і гістарычнымі рамкамі.

**Цэхавая арганізацыя рамяства** – сістэма аб'яднання рамеснікаў адной прафесіі ў феадальных гарадах, накіраваная супраць какурэнцыі з боку рамеснікаў, якія не былі членамі цэха (партачы) і на рэгламентацыю вытворчасці (абмежаванне колькасці прадукцыі, цэн на яе і на сыравіну) ва ўмовах невысокай ступені развіцця таварна-грашовых адносін.

**Экстэнсіўны шлях развіцця эканомікі** – шлях развіцця эканомікі, пры якім рост кольскасці выпускаемай прадукцыі дасягаецца за кошт будаўніцтва новых прадпрыемстваў, павялічэння колькасці працуючых і за кошт росту капіталаўкладанняў у народную гаспадарку.

**Этнагенез** (ад грэч. □θνος – "племя, народ" і γένεσις – "паходжанне, развіцце") – працэс фармавання этнічнай супольнасці ад ранніх (род, племя) да сталых (народнасць, нацыя) форм. На тэрыторыі Еўропы падзяляецца на "даіндаеўрапейскі" і "індаеўрапейскі" перыяды.

## ПЕРСАНАЛІІ

**Альгерд** (каля 1295 – 1377) – вялікі князь літоўскі (1345–1377), сын Гедыміна (Гедзіміна). Пашырыў тэрыторыю ВКЛ пасля перамогі над войскам Арды ў бітве на р. Сінія Воды у 1362 г. за кошт Кіеўшчыны і Падолля; завяяваў Валынь у барацьбе з Польшчай.

**Астрожскі Канстанцін** (1460–1530) – князь са старажытнага роду тураўскіх князёў. Гетман ВКЛ з 1497 г., віленскі кашталян з 1511 г., ваявода трокскі з 1522 г., актыўны абаронца праваслаўя, выдатны палкаводзец. Атрымаў перамогу ў 63 бітвах супраць крымскіх татар і маскоўскага войска, найбольш значная з іх – бітва на р. Крапіўне пад Оршай (1514).

**Баторый Стэфан** (1533 – 1586) – паходзіў са старажытнага венгерскага роду Баторыяў Шомліо, вялікі князь літоўскі і кароль польскі з 1576 г., рэзідэнцыя якога знаходзілася ў Гродна. Таленавіты палкаводзец, мецэнат навук. Пры ім завяршылася Лівонская вайна, былі створаны Віленская езуіцкая акадэмія – першая вышэйшая навучальная установа ў ВКЛ, Галоўны Трыбунал – вышэйшы судовы орган ВКЛ. Падтрымліваў каталіцкую царкву і езуітаў.

**Будны Сымон** (каля 1530 – 1593) – царкоўны дзеяч, вучоны-філосаф, прыхільнік памяркоўнай плыні ў арыянстве. Надрукаваў у Нясвіжы першую кнігу на старажытнабеларускай мове "Катэхізіс" (1562)

**Варонка Язэп** (або Іосіф, 1891 –1952) – беларускі палітычны дзеяч, паэт і журналіст. З 1917 г. член ЦК Беларускай Сацыялістычнай Грамады (БСГ), з 1918 г. першы старшыня і міністр замежных спраў Народнага Сакратарыята Беларусі – першага беларускага ўрада. З 1923 г. у ЗША ўзначальваў Беларуска-амерыканскую нацыянальную асацыяцыю, выдаваў газету "Беларуская трыбуна".

**Вітаўт Вялікі** (1350 – 1430) – вялікі князь літоўскі з 1392 г. Вёў барацьбу з Ягайлам за ўладу. У час яго княжання ВКЛ дасягнула найбольшай магутнасці ў Цэнтральнай і Усходняй Еўропе. У пераможнай Грунвальдскай бітве 1410 г. узначальваў войска ВКЛ.

**Данілеўскі Мікалай** Якаўлевіч (1822–1885) – рускі сацыёлаг, заснавальнік цывілізацыйнай тэорыі развіцця грамадства, аўтар канцэпцыі аб лакальных "культурна-гістарычных тыпах" (цывілізацыях) у рабоце "Расія і Еўропа" (1869).

**Ефрасіння Полацкая** (1104? – 1167) – Прадслава, дачка полацкага князя Святаслава, унучка Усяслава Чарадзея. У юнацкім узросце стала манашкай, атрымаўшы імя Ефрасіння, пазней – ігуменняй Полацкага манастыру. Заснавала ў Полацку жаночы і мужчынскі манастыры. Па яе заказе зроблена

беларуская хрысціянская святыня – крыж Лазара Богшы. У канцы жыцця ажыццявіла паломніцтва ў Палясціну да "труны гасподняй". Першая з жанчын усходніх славян далучана да ліку святых, лічыцца заступніцай Беларусі.

**Жылуновіч Зміцер** (Дзмітрый) (1887 – 1937) – беларускі літаратурны і грамадскі дзеяч, гісторык. З 1918 г. сакратар Беларускага нацыянальнага камісарыята, з 1919 г. першы старшыня Часовага рабоча-сялянскага ўрада ССРБ. Акадэмік Беларускай акадэміі навук, літаратурны псеўданім Цішка Гартны.

**Ігнатоўскі Усевалад** Макаравіч (1881 – 1931) – беларускі гісторык, грамадскі і палітычны дзеяч. З 1917 г. – член ЦК БСГ, з 1918 г. – член ЦК Беларускай партыі сацыялістаў-рэвалюцыянераў, у 1920 г. стварыў "Беларускую камуністычную арганізацыю" (БКА). Народны камісар земляробства БССР, у 1921 – 1926 гг. народны камісар асветы БССР. З 1925 г. дырэктар Інстытута беларускай культуры (Інбелкульта), з 1929 г. – першы прэзідэнт Беларускай акадэміі навук. У 1931 г. рэпрэсаваны, скончыў жыццё самагубствам.

**Каліноўскі Кастусь** (1838 – 1864) – беларускі рэвалюцыянер-дэмакрат, адзін з кіраўнікоў паўстання 1863 – 1864 гг. у Польшчы, Беларусі і Літве. Вылучыў ідэю стварэння беларускай дэмакратычнай дзяржавы, выдаваў першую рэвалюцыйна-дэмакратычную газету на беларускай мове "Мужыцкая праўда".

**Касцюшка Тадэвуш** (1746–1817) – прадстаўнік старажытнага шляхецкага роду, ураджэнец Беларусі, вучыўся ў школе манаскага ордэна піяраў, Варшаўскім кадэцкім корпусе, тры гады ў Парыжы. Нацыянальны герой ЗША і Польшчы, ганаровы грамадзянін Францыі. Кіраўнік паўстання 1794 г. супраць падзелаў Рэчы Паспалітай.

**Кірыла Тураўскі** (каля 1113 – каля 1190) – усходнеславянскі царкоўны дзеяч, епіскап у Тураве, які ажыццявіў рэлігійны подзвіг "стоўпніцтва". Аўтар шматлікіх "Слоў" і пропаведзяў. Сучаснікі называлі яго Златавустам. У 1984 г. уключаны ў Сабор беларускіх святых.

**Лукашэнка Аляксандр** Рыгоравіч (нар. 1954 г.) – Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь (абраны ў 1994, 2001, 2006, 2010, 2015 гг.), Галоўнакамандуючы Узброенымі Сіламі Рэспублікі Беларусь, прэзідэнт Нацыянальнага алімпійскага камітэта Беларусі. Па яго ініцыятыве праведзены рэферэндумы 1995, 1996 і 2004 гг. Ініцыятар падпісання дагавораў аб стварэнні Супольнасці (1996), Саюза (1997) і Саюзнай дзяржавы (1999) паміж Беларуссю і Расіяй.

**Луцкевічы Антон** (1884–1946?) і **Іван** (1881–1919) – браты, вядомыя палітычныя і грамадскія дзеячы беларускага адраджэння ў пачатку XX ст., адны з заснавальнікаў Беларускай сацыялістычнай грамады (БСГ), газет "Наша

доля”, “Наша ніва”, Беларускага гістарычнага музея ў Вільні. А. Луцкевіч узначальваў Раду народных міністраў БНР (1918), быў адным з актыўных удзельнікаў Таварыства беларускай школы ў Заходняй Беларусі.

**Мазураў Кірыла** Трафімавіч (1914 – 1989) – савецкі партыйны і дзяржаўны дзеяч, адзін з арганізатараў антыфашысцкага падполля і партызанскага руху ў перыяд Вялікай Айчыннай вайны, першы сакратар ЦК Камуністычнай партыі Беларусі (1956–1965), першы намеснік Старшыні Савета Міністраў СССР, член Палітбюро (Прэзідыума) ЦК КПСС (1965–1978). Герой Сацыялістычнай Працы (1974)

**Машэраў Пётр** Міронавіч (1918–1980) – беларускі партыйны і дзяржаўны дзеяч, адзін з арганізатараў і кіраўнікоў антыфашысцкага падполля і партызанскага руху ў перыяд Вялікай Айчыннай вайны, Герой Савецкага Саюза, Герой Сацыялістычнай працы. Першы сакратар ЦК КПБ (1965–1980). З 1966 г. – член Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР.

**Міндоўг** (1195–1268) – заснавальнік і першы вялікі князь Вялікага княства Літоўскага (каля 1240 – 1263) з цэнтрам у Навагародку. Аб’яднаў пад сваёй уладай усходнія землі Літвы, Навагародскую зямлю і частку Полацкай зямлі. У 1253 г. прыняў тытул караля, вёў барацьбу з крыжакамі.

**Мяснікоў Аляксандр** Фёдаравіч (Мяснікян, 1886–1925) – атыўны ўдзельнік устанаўлення савецкай улады ў Беларусі. З верасня 1917 г. па май 1918 г. старшыня Паўночна-Заходняга абласнога камітэта Расійскай Камуністычнай партыі (бальшавікоў) – РКП(б), з лістапада 1917 г. – галоўнакамандуючы Заходнім фронтам. Са студзеня 1918 г. – старшыня Абласнога выканаўчага камітэта Заходняй вобласці і фронту (Аблвыкамзах). 3 – 27 лютага 1919 г. – старшыня ЦВК Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі Беларусь. З 1920 г. – на партыйнай рабоце ў Закаўказзі.

**Панамарэнка Панцеляймон** Кандратавіч (1902–1984) – беларускі і савецкі дзяржаўны, палітычны дзеяч. З 30 мая 1942 г. кіраўнік Цэнтральнага штаба партызанскага руху (ЦШПР) у час Вялікай Айчыннай вайны, генэрал-лейтэнант (1943). Першы сакратар ЦК КП Беларусі (1938–1947), старшыня Савету Народных Камісараў БССР (з 1946 г. – Савету Міністраў) у 1944–1948 гг.

**Рагвалод** (? – 980?) – першы гістарычна вядомы полацкі князь, які прыйшоў “з-за мора” (магчыма з тэрыторыі Паўночнай Еўропы), заснавальнік дынастыі Рагвалодавічаў. Імкнуўся ўмацаваць Полацкае княства, кантраляваць шлях “з варагаў у грэкі” на р. Заходняя Дзвіна. Згодна летапіснаму паданню, каля 980 г. Рагвалод і яго два сыны былі забіты, а яго дачка Рагнеда была прымусова ўзята замуж князем Уладзімірам Святаслававічам з Ноўгарада – будучым вялікім князем Кіеўскай Русі.

**Радзівіл Мікалай Чорны** (1515–1565) – прадстаўнік магнацкага рода Радзівілаў, дзяржаўны і рэлігійны дзеяч, мецэнат. Берасцейскі староста, канцлер ВКЛ. Першым з усіх магнатаў прыняў Рэфармацыю, узначаліў кальвініцкія зборы ў ВКЛ. Пры яго ўдзеле заснаваны друкарні ў Берасці і Нясвіжы.

**Рурык** (? – 879) – вараг, наўгародскі князь (862–879), летапісны заснавальнік дынастыі Рурыкавічаў – князёў Русі, якая пазней стала царскай.

**Сапега Леў** (1557–1633) – выдатны палітычны і грамадскі дзеяч ВКЛ, прадстаўнік вядомага магнацкага роду. Канцлер Вялікага княства Літоўскага, дыпламат. Удзельнічаў у Лівонскай вайне. Адзін з арганізатараў вышэйшага судовага органа ВКЛ – Галоўнага Трыбунала. Узначаліў камісію па складанні Статута ВКЛ 1588 г. і фінансаваў яго выданне. Садзейнічаў заключэнню Брэсцкай царкоўнай уніі 1596 г.

**Скарына Францыск** (каля 1490 – каля 1551) – беларускі і усходнеславянскі першадрукар, вучоны, мысліцель і гуманіст эпохі Адраджэння. Нарадзіўся ў Полацку. У 1517 – 1519 гг. выдаў у Празе 23 друкаваныя кнігі Бібліі са сваімі прадмовамі і пасляслоўямі. Заснаваў друкарню ў Вільні, дзе выйшлі "Малая падарожная кніжыца" і "Апостал".

**Сталыпін Пётр** Аркадзіевіч (1862–1911) – расійскі дзяржаўны дзеяч. Гродзенскі губернатар (1902–1903), з 1906 г. – міністр унутраных спраў і старшыня Савета Міністраў Расіі, ініцыятар правядзення аграрнай рэформы, звязанай з разбурэннем сялянскай абшчыны, замацаваннем надзельнай зямлі ў асабістую ўласнасць сялян, перасяленнем малазямельных на ўскраіны Расійскай імперыі. Па яго праекце ў 1911 г. у Віцебскай, Магілёўскай і Мінскай губернях былі ўведзены выбарныя земствы.

**Станіслаў Аўгуст Панятоўскі** (1732–1798) – апошні кароль польскі і вялікі князь літоўскі (1764–1795), быў звязаны з групоўкай Чартарыйскіх. У 1750-я гг. як пасол Саксоніі і Рэчы Паспалітай знаходзіўся ў Санкт-Пецярбургу. Пры ім была створана Адукацыйная камісія, прынята Канстытуцыя Рэчы Паспалітай ад 3 мая 1791 г. Пасля падзелаў Рэчы Паспалітай падпісаў акт адрачэння ад прастолу на карысць Кацярыны II.

**Тарашкевіч Браніслаў** Адамавіч (1892–1938?) – беларускі палітычны і грамадскі дзеяч, вучоны-філолаг. Член БСГ (1917). У Заходняй Беларусі: старшыня Беларускага пасольскага клуба (1922–1924), адзін са стваральнікаў і старшыня Беларускай сялянска-работніцкай грамады (1925), адзін з кіраўнікоў Таварыства беларускай школы (ТБШ). Аўтар першай "Беларускай граматыкі для школ" (1918). Акадэмік Акадэміі навук Беларусі (1928). Рэпрэсаваны органамі НКУС і Пракуратуры СССР, рэабілітаваны ў 1957 г.

**Тухачэўскі Міхаіл** Мікалаевіч (1893–1937) – савецкі ваенны дзеяч, Маршал Савецкага Саюза (1935). Нарадзіўся на Смаленшчыне, удзельнік Першай сусветнай вайны, герой Грамадзянскай і Польска-савецкай войнаў. З красавіка 1920 г. узначаліў Заходні фронт і ў ліпені ажыццявіў наступленне ў напрамку Мінск – Беласток – Варшава. У выніку польскага контрудара ў жніўні яго войскі былі разбіты, заходнія часткі Беларусі і Украіны ізноў заняты польскай арміяй. Расстраляны ў час сталінскіх рэпрэсій, рэабілітаваны ў 1957 г.

**Уладзімір Святаслававіч** (Хрысціцель, Чырвонае Сонейка, 960 – 1015) – прадстаўнік ноўгарадскай дынастыі Рурыкавічаў, з 980 г. вялікі князь Кіеўскай Русі. Пры ім на Русі хрысціянства было ўведзена ў якасці дзяржаўнай рэлігіі (988).

**Усяслаў Брачыслававіч** (Чарадзей, каля 1028–1101) – полацкі князь (1044 – 1101). У час яго праўлення Полацкая дзяржава дасягнула найвышэйшай магутнасці, тэрыторыя павялічылася. Пры ім будаваўся Сафійскі сабор у Полацку (1055–1060).

**Чарвякоў Аляксандр** Рыгоравіч (1892–1937) – беларускі савецкі партыйны і дзяржаўны дзеяч. У 1917 г. – удзельнік Кастрычніцкай рэвалюцыі ў Петраградзе і Усебеларускага з'езду ў Мінску. У 1918 г. старшыня Беларускага нацыянальнага камісарыята (Белнацкома). Падпісаў Маніфест аб абвяшчэнні ССРБ (1919), народны камісар асветы ў яе першым урадзе. Старшыня ЦВК і Савета Народных Камісараў (СНК) БССР у 1920–1924 гг.; старшыня ЦВК БССР у 1920–1937 гг. Удзельнік стварэння і адзін з чатырох старшынь ЦВК СССР (1922). Актыўны прыхільнік палітыкі беларусізацыі. У 1937 г. не вытрымаў абвінавачванняў у недастатковай рабоце па знішчэнню "ворагаў народа" і скончыў жыццё самагубствам. Рэабілітаваны ў 1952 г.

**Шушкевіч Станіслаў** Станіслававіч (нар. 1934) – дзяржаўны і грамадскі дзеяч Беларусі, член-карэспандэнт Нацыянальнай Акадэміі навук Беларусі (1982), доктар фіз.-мат. навук, прафесар. З 1990 г. дэпутат, першы намеснік, у 1991-1994 гг. – Старшыня Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь 12-га склікання, з 1996 г. дэпутат Вярхоўнага Савета РБ 13-га склікання. З 1998 г. – старшыня Беларускай сацыял-дэмакратычнай Грамады. 8 снежня 1991 г. удзельнічаў у падпісанні Белавежскіх пагадненняў.

**Ягайла** (1348?–1434) – вялікі князь літоўскі ў 1377–1381 і 1387–1392 гг. Малодшы сын Альгерда. У 1385 г. заключыў дынастычна-палітычную унію з Польшчай. Кароль польскі Уладзіслаў II, пачынальнік дынастыі Ягелоннаў (1386–1434). Праводзіў палітыку акаталічвання беларускага насельніцтва. У Грунвальдскай бітве 1410 г. ажыццяўляў агульнае кіраўніцтва саюзнымі войскамі ВКЛ і Польшчы.

Вучэбнае выданне

*Кавалёва Наталля Мікалаеўна*
*Малыхіна Людміла Юр'еўна*

# МЕТАДЫЧНЫЯ РЭКАМЕНДАЦЫІ

# ПА ВЫВУЧЭННЮ ДЫСЦЫПЛІНЫ "ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСІ"

Ответственный за выпуск: Ковалёва Н.Н.
Редактор: Боровикова Е.А.
Компьютерная вёрстка: Соколюк А.П.
Корректор: Никитчик Е.В.

---

ISBN 978-985-493-367-2

9 789854 933672

Издательство БрГТУ.
Свидетельство о государственной регистрации издателя, изготовителя, распространителя печатных изданий № 1/235 от 24.03.2014 г.
Подписано в печать 07.04.2016 г. Формат 60х84 $^{1}/_{16}$.
Бумага «Performer». Гарнитура «Times New Roman».
Усл. печ. л. 1,86. Уч. изд. л. 2,0. Заказ № 427.
Тираж 100 экз. Отпечатано на ризографе учреждения образования «Брестский государственный технический университет». 224017, г. Брест, ул. Московская, 267.